



XXV МЕЖДУНАРОДНЫЙ НАУЧНЫЙ КОНГРЕСС
«ОЛИМПИЙСКИЙ СПОРТ И СПОРТ ДЛЯ ВСЕХ»

# ОЛИМПИЙСКИЙ СПОРТ И СПОРТ ДЛЯ ВСЕХ

## Материалы XXV Международного научного конгресса

Часть 1

15–17 октября 2020 г.



Минск
БГУФК
2020

Международная ассоциация университетов физической культуры и спорта
Национальный олимпийский комитет Республики Беларусь
Министерство спорта и туризма Республики Беларусь
Президентский спортивный клуб
Белорусский государственный университет физической культуры
Белорусская олимпийская академия
Республиканский научно-практический центр спорта
Белорусская федерация спорта на роликах и скейтбордах
Национальное антидопинговое агентство Республики Беларусь

# ОЛИМПИЙСКИЙ СПОРТ И СПОРТ ДЛЯ ВСЕХ

Материалы XXV Международного научного конгресса

15–17 октября 2020 г.

В двух частях

Часть 1

Минск
БГУФК
2020

УДК 769.032(06)+796.034
ББК 75.4ф+75.0
О-54

*Рекомендовано к изданию редакционно-издательским советом БГУФК*

Редакционная коллегия:
д-р экон. наук, доцент (гл. редактор) *С. Б. Репкин;*
канд. пед. наук, доцент (зам. гл. редактора) *Т. А. Морозевич-Шилюк;*
д-р филос. наук, доцент *Т. Н. Буйко;*
д-р пед. наук, профессор *В. А. Коледа;*
д-р пед. наук, профессор *М Е. Кобринский;*
д-р пед. наук, д-р биол. наук, доцент *А. А. Михеев;*
д-р пед. наук, профессор *А. Г. Фурманов;*
д-р пед. наук, профессор *Т. П. Юшкевич*

**Олимпийский** спорт и спорт для всех : материалы XXV Междунар. науч.
О-54 конгр., Минск, 15–17 окт. 2020 г. : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т физ. культуры ; редкол. : С. Б. Репкин (гл. ред.), Т. А. Морозевич-Шилюк (зам. гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУФК, 2020. – Ч. 1. – 527 с.
ISBN 978-985-569- 492-3 (ч. 1).
ISBN 978-985-569-491-6.

Издание представляет собой сборник статей XXV Международного научного конгресса «Олимпийский спорт и спорт для всех».

В первой части сборника представлены направления «Проблемы олимпийского спорта и олимпийского образования» и «Спорт для всех: проблемы двигательной активности и здорового образа жизни».

Издание предназначено для специалистов отрасли «Физическая культура, спорт и туризм», преподавателей, научных работников, аспирантов и студентов.

**УДК 769.032(06)+796.034**
**ББК 75.4ф+75.0**

**ISBN 978-985-569-492-3 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-569-491-6**
© Учреждение образования «Белорусский государственный университет физической культуры», 2020

например, на образование, посещение международной Олимпийской академии, участие в тренировочных мероприятиях с командой страны, на поездку на Олимпийские игры в качестве зрителя.

**Вывод.** Современный формат проведения Юношеских Олимпийских игр требует реорганизации концептуальных основ и положений в соответствии гуманистическим потенциалом олимпийского движения.

1. Лубышева, Л. И. Проблемное поле современного олимпийского спорта в контексте перезагрузки ценностей олимпизма / Л. И. Лубышева, Д. И. Иванов // Физическая культура: воспитание, образование, тренировка. – 2019. – № 1. – С. 2–5.

2. Лубышева, Л. И. Современные вызовы олимпийского спорта / Л. И. Лубышева // Спорт. Олимпизм. Здоровье: материалы Междунар. науч. конгр., 19–21 сент. 2019 г., Кишинев, Молдова, 2019 г. – С. 163–164.

3. Лубышева, Л. И. Новый формат Юношеских Олимпийских игр в аспекте социологического анализа / Л. И. Лубышева, Д. И. Иванов // Физическая культура: воспитание, образование, тренировка. – 2020. – № 2. – С. 20–22.

4. Платонов, В. Н. Форсирование многолетней подготовки спортсменов и Юношеские Олимпийские игры / В. Н. Платонов, И. М. Большакова // Наука в Олимпийском спорте. – 2013. – № 2. – С. 38–42.

**УДК 796.032:101**

***Люкевіч Ул.П.,*** канд. філас. навук, дацэнт
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
Рэспубліка Беларусь, Брэст

## ФІЛАСОФІЯ АЛІМПІЗМУ: МАРАЛЬНЫ КРЫЗІС

***Lukievic U.***
Brest State University
Republic of Belarus, Brest

## PHILOSOPHY OF OLYMPISM: MORAL CRISIS

ABSTRACT. The establishment and development of the Olympic was based on subjective romantic and sentimental ideas of sports by the French Baron Pierre de Coubertin for a long time. One of his key points was the concept of “amateurism”, which was more than once provoked controversial discussions in society. The fundamental principles of the Olympic Charter had largely taken into account this essential aspect. In addition, a special supplementary regulatory article was introduced for admission to the Games, which prohibited professionals to take part in competitions. However, the shift in the paradigm of sports development in conditions of democratization, liberalization and humanization of society forced a number of the Olympic Charter articles to be modified. As a result, professional athletes can participate in the Olympic Games. At the same time, the philosophy of Olympism is continuing to face negative moral manifestations that testify

the ongoing crisis: there are apartheid, racial and social inequality, ideological and political confrontation, fraud and doping at the state level, etc. To avoid the further decline of the Olympic movement it is necessary to modernize an old philosophical doctrine in accordance with the requirements of contemporary world. In this case the concept of Fair play must become a new paradigm in the development of modern sports.

KEYWORDS: sports; Olympism; Olympic movement; philosophy of Olympism; Olympic motto; development paradigm; Fair play; doping

АНАТАЦЫЯ. Станаўленне і развіццё алімпійскага руху працяглы час базавалася на падставе суб’ектыўных рамантычных і сантыментальных уяўленняў аб спорце французскага барона П’ера дэ Кубертэна. Адным з ключавых яе момантаў была канцэпцыя “аматарства”, якая неаднойчы выклікала супярэчлівыя дыскусіі ў грамадстве. Фундаментальныя прынцыпы Алімпійскай хартыі ў значнай ступені ўлічвалі гэты важны аспект. Акрамя таго, для допуску да Гульняў быў уведзены спецыяльны дадатковы артыкул у правілах, які забараняў прафесіяналам удзельнічаць у спаборніцтвах. Аднак змены парадыгмы развіцця спорту ў варунках демакратызацыі, лібералізацыі і гуманізацыі грамадства прымусілі да мадыфікацыі шэрагу артыкулаў Алімпійскай хартыі, і зараз прафесійныя атлеты маюць магчымасць удзельнічаць у Алімпійскіх гульнях. Разам з тым філасофія алімпізму працягвае сутыкацца з негатыўнымі праявамі маральнага характару, якія сведчаць аб крызісе: апартэід, расавая і сацыяльная няроўнасць, ідэялагічная і палітычная канфрантацыя, махлярства і допінг на дзяржаўным узроўні і г. д. Каб пазбегнуць далейшага заняпаду алімпійскага руху неабходна мадэрнізаваць старую філасофскую дактрыну згодна з патрабаваннямі навейшага часу. У такім выпадку канцэпцыя Fair play павінна стаць новай парадыгмай развіцця сучаснага спорту.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: спорт; алімпізм; алімпійскі рух; філасофія алімпізму; алімпійскі дэвіз; парадыгма развіцця; Fair play; донінг

**Уводзіны.** Станаўленне і развіццё філасофіі алімпізма непарыўна звязваецца з фармаваннем і функцыянаваннем алімпійскага руху, які паўстаў на ідэалагічных і духоўных падставах, што былі ў свой час распрацаваныя П’ерам дэ Кубертэнам (Pierre de Coubertin, 1863–1937) [5]. Ягоныя сантыментальна-ідэалістычныя погляды на спорт на пераломе XIX–XX стагоддзяў увасобіліся ў фармаванне канцэпцыі аматарства, якую ён лічыў найбольш прыдатнай для вызначэння ролі гэтага грамадскага феномену ў сацыяльна-эканамічных варунках таго часу [7]. Аднак істотныя змены сутнаснага парадку ў гістарычнай перспектыве прымушаюць да больш дакладнага асэнсавання месца і ролі спорту ў жыцці грамадства. Як падкрэслівае Е. Касевіч (J. Kosiewicz), паэтычнае выказванне П. дэ Кубертэна адносна таго, што “спорт – гэта прыгажосць”, можна трактаваць адзіна як мастацкае ўвасабленне суб’ектыўнай перцэпцыі, бо, напрыклад, спаборніцтва прафесійнага баксёра ці каратыста з пачаткоўцам адназначна не будзе выглядаць як захапляльнае відовішча [8].

Сучасны алімпізм на падставе філасофскага асэнсавання можа быць вызначаны ў некалькіх магчымых семантычных меркаваннях, але перад усім у кантэксце свайго першаснага старажытнагрэцкага звычаю спартыўных спаборніцтваў у святой анклаве Алімпіі. Яго з поўным правам можна трактаваць як пэўную ідэялогію ці сістэму каштоўнасцяў, што маюць гістарычныя повязі ад тэарэтычных разважанняў

на гэты конт у пісьмовых тэкстах П. дэ Кубертэна да дэкларацыяў і кодэксаў, якія афіцыйна выдаваліся з боку Міжнароднага алімпійскага камітэту (International Olympic Committee). Калі рабіць нейкія больш шырокія высновы, то алімпізм як пэўная тэарэтычная дактрына выступае ў форме грамадскага руху, што дазваляе вызначаць як чыста спартыўны бок, так і іншыя элементы дадзенага феномену [9]. Зразумела, каб больш дакладна ўявіць гістарычную рэтраспектыву функцыянавання спорту ўвогуле і алімпійскага спорту ў прыватнасці, – хоць у прадстаўленым падыходзе гэтыя паняцці ў большасці выпадкаў перасякаюцца паміж сабой – а таксама вызначыць далейшую перспектыву развіцця гэтай сацыяльнай з'явы, з неабходнасцю трэба засяродзіць увагу на стрыжнявых момантах, якія вызначаюць філасофскія падставы яе развіцця і распаўсюджвання, што паўстае ў якасці вызначальнай мэты і звязваецца з актуальнымі праблемамі спартыўнай рэчаіснасці, напрыклад, допінгавага злаўжывання. Гэта мае дастаткова важнае значэнне ў пытаннях, якія адносяцца да этычных аспектаў дадзенага віду чалавечай дзейнасці. У якасці аб'екта даследавання выступае алімпізм як філасофская канцэпцыя. Пры напісанні дадзенага матэрыялу выкарыстоўваліся такія метады даследавання, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз, а таксама вывучэнне афіцыйных рэгламентацыйных дакументаў, навуковых крыніцаў і інфармацыйных рэсурсаў інтэрнэту. Арганізацыя даследавання ажыццяўлялася шляхам збору матэрыялаў, якія дазвалялі ахарактарызаваць галоўныя тэндэнцыі развіцця спорта ў яго алімпійскім вызначэнні на падставе суб'ектыўнай перцэпцыі і аўтарскага бачання тых грамадска-эканамічных і палітычных працэсаў, што адбываліся ў адпаведны час.

**Галоўная частка.** Сучасны алімпійскі спорт базуецца на традыцыях гістарычнай мінуўшчыны, але на кожным этапе свайго развіцця ягоная ўнутраная сутнасць істотна мяняецца і ў дастаткова моцнай ступені залежыць ад падставовых тэндэнцыяў развіцця грамадства. Цягам апошніх больш як за сто гадоў можна вызначыць некалькі перыядаў змены парадыгмы функцыянавання дадзенага сацыяльнага феномену. На пачатковым этапе свайго развіцця галоўнай задачай спорту было прыцягненне да гэтай сферы чалавечай дзейнасці як мага большай колькасці зацікаўленых людзей, і таму няма нічога дзіўнага ў тым, што першы алімпійскі дэвіз быў сфармуляваны даволі проста: ***"Галоўнае не перамога, а ўдзел".*** Такі падыход дазволіў у даволі кароткі перыяд часу стварыць магчымасці папулярызацыі спорту ў шырокіх колах публічнасці і прапагандаваць яго ў самых розных варыяцыях.

Па меры усталявання сваёй інстытуцыялізацыі і далейшага распаўсюджвання спорт набывае пэўныя арганізацыйныя структуры, што стварае падставы пераходу да ўспрымання новай якасці яго ўнутранага зместу: ***"Altius. Citius. Fortius" ("Хутчэй. Вышэй. Мацней").*** Пачынаецца перыяд дэманстрацыі дасягненняў магчымасцяў чалавечага арганізма ў разнастайных дысцыплінах. Спаборніцтвы, якія адбываюцца на міжнародным узроўні, прыцягваюць увагу ўсё большай колькасці зацікаўленых людзей. Адбываюцца нацыянальныя, рэгіянальныя, кантынентальныя і сусветныя чэмпіянаты, а таксама зімовыя і летнія Алімпійскія гульні: спорт імклівымі крокамі набліжаецца да сваёй прафесіяналізацыі. Гэтае апошняе ва ўсё большай ступені абвастрае даўнюю праблему супрацьстаяння паміж абаронцамі канцэпцыі аматарства і прыхільнікамі прафесіяналізму, што раней неаднойчы паказвала на праявы крызісу ў сістэме дзейнасці МАК. Дастаткова звярнуцца да характарыстыкі гістарычных

падзеяў на падставе аналізу прыняцця рашэнняў па гэтым пытанні ягонага вышэйшага кіраўніцтва [10]. Так, напрыклад, Анры дэ Байле-Лятур (Henri de Baillet-Latour, 1876–1942), трэці прэзідэнт гэтай арганізацыі, надаваў шмат намаганняў для размежавання паняццяў аматарскага і прафесійнага спорту: ён паслядоўна прытрымліваўся думкі аб тым, што прафесіяналы не маюць права ўдзельнічаць у Алімпійскіх гульнях, і аматарства павінна дамінаваць над імі, а прынцыпы Fair play паўстаюць як базіс Алімпійскага руху. Праўда, калі з алімпійскай праграмы па гэтай прычыне былі выведзеныя шэраг відаў спорту, то неўзабаве ўзнікла канфліктная сітуацыя паміж МАК і адпаведнымі спартыўнымі федэрацыямі. Працяг канфрантацыі з прафесійнымі спартоўцамі з боку Анры дэ Байле-Лятура базаваўся на ягоным непарушным асабістым уяўленні пра тое, што менавіта аматарства складае вялікую каштоўнасць алімпізму, і менавіта аматарства гарантуе роўнасць сярод атлетаў, і ніводная асоба не павінна мець фінансавай падтрымкі. Такое становішча зрэшты было падмацавана шырока распаўсюджаным у грамадстве меркаваннем аб недапушчальнасці для моладзі зарабляць сабе грошы за пасярэдніцтвам спорту. З іншага боку трэба таксама прымаць пад увагу і тое, што на той час займацца спортам маглі сабе дазволіць толькі забяспечаныя людзі, і такога роду занятак выглядаў хутчэй як спосаб правядзення вольнага часу [3]. Зрэшты гэтая праблема таксама не засталася па-за ўвагай наступнага прэзідэнта МАК Зігфрыда Эдстрама (Sigfrid Edström, 1870–1964). Дыскусія на тэму аматарства пад час ягонай кадэнцыі завершылася тым, што ў сувязі з адсутнасцю дакладнага інтэрпрэтавання дадзенага паняцця было вырашана прыняць палажэнне, згодна з якім спартоўцам-аматарам абвяшчаўся атлет, чыя сувязь са спортам ніколі не была звязаная з атрыманнем матэрыяльных выгадаў ні ў якім выглядзе [4]. Крызіс філасофіі спорту выявіўся і на наступным этапе функцыянавання і развіцця алімпійскага руху, калі МАК узначаліў Эйвэры Брандыдж (Avery Brundage, 1887–1975). Палітыка настолькі моцна стала ўплываць на спорт, што пад пагрозай апынуўся змест фундаментальных прынцыпаў Аліпійскай хартыі [1]. Апошнія намаганні ў спробах захавання папярэдняй тэндэнцыі развіцця алімпізму і алімпійскага руху былі зробленыя лордам Кілланінам (Michael Morris Killanin, 1914–1999). Філасофія алімпізму фармальна базавалася на прынцыпах гарманічнага развіцця чалавечай асобы, святога міру, сумленнай і высакароднай барацьбы на спартыўных спаборніцтвах. Але ў перыяд 1970–1980 гадоў мінулага стагоддзя ўзнікае рэальная пагроза дэгуманізацыі. Гэта быў крызісны момант у функцыянаванні сусветнага алімпійскага руху. Міжнароднае супольніцтва яшчэ не да канца аправілася ад паследстваў “халоднай вайны”, як пачалі адбывацца іншыя негатыўныя з’явы планетарнага характару, што паставіла пад удар нават існаванне самага Міжнароднага аімпійскага камітэту Апартэід, тэрарызм, ксенафобія, нецярпімасць... рантнасць у сістэме сацыяльных зносінаў зрабіліся звычайнымі з’явамі, якія знайшлі сваё распаўсюджванне ў галіне спорту. Перыяд прэзідэнцтва лорда Кілланіна з 1972 па 1980 гады суправаджаўся шэрагам крызісных сітуацыяў як адносна парушэнняў філасофскіх падстаў алімпізма і прынцыпаў Алімпійскай хартыі, так і адносна здарэнняў палітычнага характару. Напрыклад, кіраўніцтва МАК апынулася ў складаным становішчы, калі ўлады Канады пад дыпламатычным націскам Кітайскай Народнай Рэспублікі адмовіліся прыняць дэлегацыю Тайваня. Гэтае рашэнне з боку краіны-гаспадара Алімпійскіх гульняў парушала не толькі ранейшыя ўрадавыя

гарантыі адносна правядзення Гульняў, больш за тое, яны парушалі фундаментальныя прынцыпы Алімпійскай хартыі, якая не дапускала ніякай формы дыскрымінацыі для атлетаў. Другой сур'ёзнай праблемай для МАК стала пагроза чарговага байкоту Гульняў у Манрэале з боку шэрагу афрыканскіх дзяржаваў [2]. Хоць па вялікім рахунку, як падкрэслівае Матт Бэрсэл [11], спартыўныя байкоты з'яўляюцца формай толькі неагрэсіўнага і негвалтоўнага пратэсту, і яны па большасці ў якасці "палітычнай зброі" выкарыстоўваюцца для ціску на нацыянальны маральны дух той ці іншай краіны, каб пазбавіць яе магчымасці ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах.

Кубертэнаўскія ілюзіі адносна функцыянавання і развіцця алімпійскага спорту на падставе рамантызму і сантыменталізму закончыліся ў 1980 годзе з моманту абрання на пост прэзідэнта Міжнароднага Алімпійскага камітэту Хуана Антоніа Самаранча (Juan Antonio Samaranch, 1920–2010). Напачатку адбыліся канцэптуальныя змены ў філасофіі алімпізму, якія пацягнулі за сабой адпаведную змястоўную рэструктурызацыю спорту ў цэлым. Алімпійскі рух пасля дзесяцігоддзяў праблемнага існавання ў пошуках фінансавай падтрымкі перайшоў на якасна іншы ўзровень свайго забеспячэння на падставе камерцыялізацыі. Пераасэнсаванне ідэялогіі алімпізму прывяло да таго, што стаўся скасаваны традыцыйны падзел на аматараў і прафесіяналаў. Варта дадаць, што ўсе папярэднікі Самаранча строга прытрымліваліся той філасофскай дактрыны, якая брала свой пачатак яшчэ з часоў Старажытнай Грэцыі. Аднак пад усціскам новых сацыяльна-палітычных і эканамічных рэаліяў з улікам глабалізацыйных працэсаў і дамінавання тэндэнцыяў дэмакратызацыі, лібералізацыі, гуманізацыі, эмансіпацыі, міграцыі і г. д. па ўсім свеце з неабходнасцю трэба было праводзіць адпаведныя арганізацыйныя рэформы. Да таго ж шырока распаўсюдзілася практыка нелегальных грашовых выплатаў спартоўцам, якая атрымала назву "шаматарызм" [6]. Відавочнае змяненне акцэнтаў знайшло сваё адлюстраванне ў тэкстах Алімпійскай хартыі: напрыклад, трактаванне паняцця "аматарства", добра вядомае як "правіла 26" [13] і адсутнасць гэтага паняцця ў рэдакцыі ад 26 чэрвеня 2019 года [12]. Камерцыялізацыя алімпійскага спорту ў выніку прывяла да таго, што ў гэты перыяд стала дамінаваць новая парадыгма, якую можна абазначыць, як "Перамога за ўсялякі кошт". Высокія ганарары для атлетаў у самых разнастайных формах не толькі за перамогу і прызавыя месцы, а нават за сам удзел у спаборніцтвах, прывялі да таго, што ў працэсе змаганняў сталі выкарыстоўвацца недазволеныя спосабы і прыёмы. На сучасны момант адной з найбольшых праблемаў застаецца допінг, а таксама ўсё больш пашыраная практыка грашовых ставак у букмекерскіх канторах на выніку канкрэтных спаборніцтваў, якія завяршаюцца па дамоўленасці некалькіх зацікаўленых бакоў. Напружаную працу ў накірунку супрацьдзеяння гэтым негатыўным тэндэнцыям распачаў МАК на чале з Жакам Раггэ (Jacques Rogge), якая на дадзены момант актыўна працягваецца пад кіраўніцтвам Томаса Баха (Thomas Bach) ў супрацоўніцтве з прэзідэнтам Сусветнага Анты-Допінгавага Агенцтва (САДА) Вітальдам Банька (Witold Bańka, WADA – World Anti-Doping Agency).

**Заключэнне.** На падставе праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя падсумаванні, якія вынікаюць з аналізу практычнай дзейнасці прэзідэнтаў Міжнароднага Алімпійскага камітэту адносна тактыкі і стратэгіі ў дзейнасці гэтай арганізацыі згодна з трактоўкамі філасофскай дактрыны алімпізму.

Першае. Сучасны алімпійскі спорт перажывае глабальны крызіс, які вынікае з супярэчнасцяў унутранага зместу абвешчаных фундаментальных прынцыпаў Алімпійскай хартыі, што ўвайшлі ў канфрантацыю з рэаліямі сацыяльнага асяроддзя.

Другое. Філасофскія рэфлексіі на конт крызіснай сітуацыі базуюцца на канцэптуальна неадназначным успрыманні і тлумачэнні сэнсу і зместу алімпійскага руху, а менавіта: няроўныя магчымасці і паглыбленне ў розьніцы падрыхтоўкі атлетаў развітых дзяржаў і тых краінаў, якія развіваюцца; павелічэнне праблемаў палітычнага, расавага, эканамічнага і г. д. характару.

Трэцяе. Крызіс філасофіі алімпізму адбываецца ў адпаведнасці са зменамі парадыгмы развіцця спорту: "Галоўнае не перамога, а ўдзел" – "Altius. Citius. Fortius" ("Хутчэй. Вышэй. Мацней") – "Перамога за ўсялякі кошт". Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя фактары грамадскага развіцця ва ўсё большай ступені ўплываюць на феномен спорту.

Чацьвёртае. Філасофская канцэпцыя алімпізму мае яскрава вызначаны этычны характар [14]. Сведчаннем такога падыходу з'яўляецца, напрыклад, рух "Black Lives Matter".

Пятае. Наступная парадыгма развіцця алімпізму з неабходнасцю павінна ўключыць паняцце "сумленнай і высакароднай гульні" – Fair play – што фармуе якасна іншы падыход да ўспрымання феномену спартыўнай дзейнасці. Як паказвае практыка развіцця і распаўсюджвання алімпійскай ідэялогіі, неўзабаве чакаецца мадыфікацыя артыкулаў 40 і 50 Алімпійскай хартыі.


1. Люкевіч, У. П. Алімнійскі рух у эпоху "халоднай вайны" / У. П. Люкевіч // Актуальные проблемы физической культуры и спорта школьников и учащейся молодежи: сб. науч. ст. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина, Упр. спорта и туризма Брест. облисполкома; под общ. ред. А. А. Зданевича. – Брест: БрГУ, 2018. – С. 68–72.

2. Люкевіч, У П. Крызіс філасофіі алімпізму ў перыяд 1972–1980 гадоў: прэзідэнт МАК Майкл Моррыс Лорд Кілланіи як абаронца ідэалаў спорту / У П. Люкевіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1: Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія: навук.-тэар. час. – № 1. – 2019. – С. 52–59.

3. Люкевіч, У. П. Прэзідэнты МАК. Анры дэ Байле-Лятур: Небяспека алімпійскага крызісу / У П. Люкевіч // Теоретические и прикладные аспекты олимпийского образования, физической культуры и спорта школьников и учащейся молодежи: сб. науч. ст. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина, Упр. спорта и туризма Брест. облисполкома; под общ. ред. А. А. Зданевича. – Брест: БрГУ, 2017. – С. 80–85.

4. Люкевіч, У. П. Прэзідэнты МАК. Зігфрыд Эдстрам: Алімпійскі рух па заканчэнні Другой сусветнай вайны / У П. Люкевіч // Актуальные проблемы теории и методики физического воспитания и спортивной тренировки: материалы Респ. науч.-практ. конф., Брест, 20–21 апр. 2018 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина; редкол.: И. Ю. Михута, К. И. Белый, С. К. Якубович. – Брест: БрГУ, 2018. – С. 34–38.

5. Люкевіч, У. П. Прэзідэнты МАК. П'ер дэ Кубертэн: Алімпійская ідэя / У П. Люкевіч // Гульні і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: змены сацыяльнай парадыгмы: зб. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; рэдкал.: У. П. Люкевіч (старш.) [і інш.]. – Брэст: БрДУ, 2017. – С. 3–8.

6. Люкевіч, У П. Філасофія алімпізму. Хуан Антоніа Самаранч: пачатак новай эпохі спорту / У. П. Люкевіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1: Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія: навук.-тэар. час. – № 2. – 2019. – С. 55–64.

7. Люкевич, Ул. Романтизм и сентиментализм Fair Play в прагматическом обществе / Ул. Люкевич // Международные спортивные юношеские игры стран СНГ, Балтии и регионов

России под патронажем Международного олимпийского комитета: II Междунар. форум «Молодежь – Наука – Олимпизм». 15–18 июня 2002 г., г. Москва. XI Конференция «Олимпийское движение и социальные процессы»: материалы. – М.: Советский спорт, 2002. – С. 128–131.
8. Kosiewicz, J. Kultura fizyczna i sport w perspektywie filozofii / J. Kosiewicz. – Warszawa: Akademia Wychowania Fizycznego Józefa Piłsudskiego, 2000. – 234 s.
9. Lipiec, J. Filozofia olimpizmu / J. Lipiec. – Warszawa: Polskie Wydawnictwo Sportowe SPRINT, 1999. – 234 s.
10. Słoniewski, M. Wpływ przewodniczących Międzynarodowego Komitetu Olimpijskiego na przemiany w międzynarodowym ruchu olimpijskim po II wojnie światowej / M. Słoniewski. – Kultura fizyczna. – Prace naukowe Akademii im. Jana Długosza w Częstochowie. – Tom XVI. – Nr 1. – 2017. – S. 47–74.
11. Bersell, M. Sports, Race, and Politics: The Olympic Boycott of Apartheid Sport [Electronic resource] / M. Bersell // Western Illinois Historical Review, Volume VIII, Spring 2017. – 31 p. – Mode of access: http://www.wiu.edu/cas/history/wihr/pdfs/wihr-sports-race-politics-olympic%20boycott.pdf. – Date of access: 21.03.2019.
12. Olympic Charter (in force as from 26 June 2019) / International Olympic Committee. – Lausanne: International Olympic Committee, 2019. – 106 p.
13. Олимпийская хартия. – М.: Международный олимпийский комитет; Олимпийский комитет СССР; Олимпийская академия СССР, 1990. – С. 20, 60–62.
14. Ethics / IOC Ethics Commission. – Lausanne: International Olympic Committee, 2020. – 117 p.

**УДК 796**

***Мальцев А.Е.***
Российский государственный университет физической культуры, спорта, молодежи и туризма (ГЦОЛИФК)
***Мельникова Н.Ю.,*** д-р пед. наук, профессор
Центральная олимпийская академия
Российская Федерация, Москва

## ЭВОЛЮЦИЯ ПРОГРАММЫ ИГР ОЛИМПИАД ПО СИНХРОННОМУ ПЛАВАНИЮ

***Maltsev A.***
Russian State University of Physical Education, Sport, Youth and Tourism (SCOLIPE)
***Melnikova N.***
Central Olympic Academy
Russian Federation, Moscow

## EVOLUTION OF THE OLYMPICS ARTISTIC SWIMMING PROGRAM

ABSTRACT. The purpose of this study was to conduct a comprehensive analysis of the artistic (synchronized) swimming competition program at the Olympics and World Championships, its evolution, as well as to determine the prospects for inclusion of mixed duets in the Olympic Games program.